# АЎТАРСКАЯ ЖУРНАЛІСТЫКА Ў ЖАНРАВАЙ ДЫНАМІЦЫ

***М. С. Цюцянькоў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tsiutsiankovMS@bsu.by*

*Навуковы кіраўнік – В. І. Іўчанкаў,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

Вызначаюцца характарыстыкі жанравай дынамікі аўтарскай журналістыкі, даецца агляд камунікатыўных сітуацый у звязку з намерамі стваральніка медыятэксту, прапануецца мадэль адлюстравання рэчаіснасці праз камунікатыўны код медыяпадзеі.

***Ключавыя словы:*** анталогія аўтарскай журналістыкі; медыярэальнасць; тэкстаўтварэнне; жанравая мадэль; тэкставы тон.

# AUTHOR’S JOURNALISM IN GENRE DYNAMICS

***M. S. Tsiutsiankou***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. S. Tsiutsiankou (tsiutsiankovMS@bsu.by)*

*Research advisor – V. I. Iuchankau, doctor of Philology, professor*

The characteristics of the genre dynamics of author’s journalism are determined, an overview of communicative situations in conjunction with the intentions of the creator of the media text is given, a model of reflecting reality through the communicative code of a media event is proposed.

***Key words:*** ontology of author’s journalism; media reality; text formation; genre model; text tone.

У журналісцкай практыцы апошнім часам узнікае патрэба выявіць аптымальную жанравую мадэль у даволі папулярным феномене, што стаў запатрабаваным сярод беларускай аўдыторыі, – аўтарскай журналістыкі. Беларускімі даследчыкамі неаднаразова адзначалася, што «спроба вызначыць жанравую прыроду матэрыялаў у сённяшніх рэгіянальных друкаваных СМІ прыводзіць да неадназначных заключэнняў з-за перападаў сэнсавых варыянтаў» [1, с. 175], і на сёння ў беларускай навуцы існуюць некаторыя прабелы ў вывучэнні жанравай дыферэнцыяцыі ў дачыненні да аўтарскай журналістыкі. Сітуацыя ў тэорыі журналістыкі паказвае, што менш устойлівыя жанры падпарадкоўваюцца больш «магутным» стылістычным жанрам. Беларускім даследчыкам неаднаразова прыходзілася апісваць сістэму жанраў, што датычацца пэўнага перыяду, аднак у айчынных працах, як і ў замежных, назіраецца сутыкненне і супярэчанне ў разуменні тэрміну «новыя жанры», таму што любы перыяд журналісцкай творчасці мае архітэктанічныя і канцэптуальныя асаблівасці, што робіць немагчымым зварот да традыцыйнай дэфініцыі жанра ў яго агульнапрынятым разуменні.

Глыбокае асэнсаваннне сістэмы жанраў пададзена ў працы Б. В. Стральцова «Метад і жанр». Вучоны паказаў, што «жанры адрозніваюцца па характары аб’екта адлюстравання, маюць канкрэтнае прызначэнне, розны маштаб высноў і абагульненняў, адрозніваюцца па характары моўна-стылістычных сродкаў» [2]. Класіфікацыя жур-налісцкіх жанраў бесперапынна перажывае змены і новыя рэдакцыі – гэта адбываецца ў адпаведнасці з запатрабаваннем часу. Натуральна, кожны навуковец прапаноўвае ўласную класіфікацыйную мадэль, што кардынальным чынам будзе адрозніваца ад папярэдніх даследаванняў. Класічная мадэль, прапанаваная прафесарам А. А. Цяртычным, заснавана на ўзаемаабумоўленых форме і змесце як асноватворных кампанентах журналісцкага жанру. Даследчык канстатуе, што «пад журналісцкімі жанрамі мяркуюцца ўстойлівыя тыпы публікацый, аб’яднаных падобнымі змястоўна-фармальнымі прыкметамі» [3, с. 12].

У тэорыі журналістыкі звыклай стала трохузроўневая мадэль сістэмы жанраў – дзяленне на інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя. Сёння актуалізуецца стэрэатып, паводле якога распаўсюджваецца думка аб тым, што паўнавартасная аналітыка патрэбна толькі якаснаму выданню, а масаваму – міні ці проста кароткая нататка. Прафесар Л. Р. Дускаева выводзіць паняцце, якое больш пады-ходзіць да

дыферэнцыяцыі аўтарскай журналістыкі ў кантэксце жанраў. Даследчыцай заўважаецца, што класіфікацыя іх грунтуецца на дыялагічнай мадэлі камунікацыі [4]. Тым не менш у журналісцкай навуцы пад жанрам неабходна разумець тэкставую структуру, якая прадугледжвае спецыфічныя заканамернасці і тыпалагічныя характарыстыкі. Жанры аднаўляюцца і нараджаюцца, і кожны з іх мае сваю прыроду. М. М. Бахцін называе гэта архетыпам [5]. Выбар жанру для журналіста – этап, які папярэднічае напісанню, аднак можна канстатаваць, што кожны тэкст відазмяняе жанр, і ў выніку жанравая мадэль паўстае ў ролі прапедэўтычнага матэрыялу. Таму намі прынята канцэпцыя дынамічнай эвалюцыі жанру як функцыянальнай катэгорыі.

Медыятэкстам з крытычнай семантыкай у аўтарскай журналістыцы характэрна іронія, заснаваная на «анестэтычным прынцыпе» [6, с. 302]. Аўтарам фарміруецца пэўная стылістычная афарбоўка, з дапамогай якой ён дае зразумець, што праз іронію выяўляецца не толькі крытычная ацэнка, але і «жыццёвая пазіцыя» – назіранне аўтарам пры адборы матэрыялу. Такі тэкставы маркер надае медыятэкстам ненадакучлівасць і непрадузятасць – якасці, неабходныя для рэалізацыі кантактаўстанаўляльнай (фатычнай) функцыі. Як адзначае прафесар А. Цяпляшына, «аналіз жанравай мадэлі аўтарскай журналістыкі паказвае, што метажанр – аптымальная форма для выражэння меркаванняў, ідэй, ацэнак, жыццёвай пазіцыі думаючымі і цікавымі для думаючай аўдыторыі асобамі» [7, с. 53]. Менавіта праз эмацыйны стан аўтара даецца канцэптуальнае бачанне праблемы ў суб’ект-суб’ектнай карэляцыі. Гэта дапамагае адрасату «ўлавіць» меркаванне адрасанта, прыняць пункт гледжання на падзею, пра якую распавядаецца ў тэксце, зрабіць глядацкі выбар і г. д.

Катэгорыі тэкставай эмоцыі (эмацыйныя адносіны аўтара да падзеі) і тэкставага тону (эмацыйныя адносіны аўтара да падзеі, працэсу ці з’явы, г. зн. рэчаіснасці, што не датычыцца звычайнай рэпарцёрскай працы) – даволі распаўсюджаная з’ява выражэння аўтарскага «я» ў медыятэксце. Яны характэрны для камунікатыўных стратэгій з высокачастотным выкарыстаннем ідэалагем – ітэрпрытацыйных прыёмаў інтэнцый крытычнага дыскурсу. Моўныя сродкі выражэння журналісцкай інтэнцыі ўяўляюць сабой набор стратэгій і тактык, пры дапамозе якіх ствараюцца жанравыя інварыянты [8]. У гэтым рэчышчы паўстае

пытанне пра тое, што ёсць аўтарская стратэгія і ці можна лічыць яе наратывам аўтараскага мыслення ў журналісцкім дыскурсе.

Стратэгія залежыць ад канчатковага выніку камунікацыі і накіравана на дасягненне мэты, закладзенай у канімунікатыўны код. Гэта можна выразіць формулай: адрасант – камунікатыўны код – адрасат. Трохэлементная мадэль ахоплівае камунікатыўны акт з пазіцый расшыфроўкі кода, які ўтрымлівае ў сабе ілакутыўныя параметры і накіраваны на дасягненне перлакутыўнага эфекту. Перцэптыўнае раскадзіраванне залежыць ад самой камунікатыўнай сітуацыі ў комплексе, у якім ядзерную ролю адыгрывае сама медыяпадзея, перыферыйную (прыядзерную) – інтэрпрэтацыйныя, афармленчыя, візуальна-семантычныя і інш. модулі. Таму прапанаваная мадэль павінна ўтрымліваць і камунікатыўную сітуацыю, у межах якой адбываецца падзея:

Адрасант ⟹ камунікатыўная сітуацыя (дыскурс + тэкст) ⟹ адрасат.

Камунікатыўныя ролі могуць змяняцца, што схематычна можна перадаць наступным чынам:

Адрасант ⟺ камунітыўныя сітуацыя (дыскурс + тэкст) ⟹ адрасат.

Пры вызначэнні дыферэнцыяльных рыс жанравай сістэмы аўтарскай журналістыкі неабходна ўлічваць не толькі суб’ект, на які накіравана вербальнае дзеянне (глядач, чытач, слухач, карыстальнік), але і атрыбутыўны аб’ект, пад якім у сітуацыі лічбавай эпохі выступае не столькі аўтарская праграма, колькі яе трансмедыйны рэсурс. Беларускі даследчык М. Л. Зайцаў неаднаразова вылучаў падыходы СМІ да працы па распаўсюджванні кантэнту, механіка якіх перажывае кардынальныя перамены пад уплывам тэхналагічных працэсаў і эвалюцыі міжасобаснай камунікацыі масавай аўдыторыі. Навукоўцам вылучаюцца змены камунікатыўных мадэлей у лічбавую эпоху, сярод якіх – карэкціроўка вербальных і невербальных складнікаў інфармацыйных фрэймаў, што «паўплывала не толькі на аб’ёмы тэкставай інфармацыі, але і на яе змест. У прыватнасці, усё большым зменам падвяргаюцца стылістычныя параметры» [9, с. 20]. Прафесар В. І. Іўчанкаў канстатуе, што «масавыя спажыўцы інфармацыі пераарыентуюцца на вуснагутарковую гаворку. Гэты факт адлюстроўвае і ў той жа час абумоўлівае граматычную і арфаэпічную непатрабавальнасць аўдыторыі» [10, с. 82]. Пад такі стылістычны ўплыў трапілі вербальныя сродкі камунікацыі. Безумоўна, пры вызначэнні адбору моўных сродкаў неабходна ўлічваць трансмедыйнасць кантэнту.

У аўтарскай журналістыцы вызначальную ролю адагрывае падзея, якой прысвечаны выпуск перадачы; працэс стварэння кантэнту і развіцця праграмы цалкам; непасрэднае стварэнне перадачы і выпуск яе да глядацка-чытацкай аўдыторыі. А. А. Цяртычным была вылучана сістэма адлюстравання рэчаіснасці, якая будуецца праз фактаграфічную, аналітычную і наглядна-зрокавую [9], што, на нашу думку, найбольш яскрава вызначае ступень асэнсавання аўтарам рэчаіснасці. Таму аўтарская журналістыка больш базіруецца на аналітычных жанрах – агляд, журналісцкае расследаванне, рэкамендацыя (парада), каментарый, маніторынг і інш.

З’яўленне новых жанраў – ужо ўстойлівая тэндэнцыя ў журналістыцы, заўважаецца, што ўсе яны канцэнтруюцца вакол аўтарскай калонкі, якую аднясём да метажанравай мадэлі, якая набыла папулярнасць і заняла сваё месца ў сістэме публіцыстычных жанраў. Калумна сёння шмат у чым уяўляе сабой платформу для рэалізацыі крытычнага мыслення і выказвання меркаванняў па мностве пытанняў, для эфектыўнага выражэння аўтарскага «я», дынамічнага ўключэння ў інфармацыйны працэс спажыўца кантэнту і наладжвання суб’ект-суб’ектных камунікатыўных зносін.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Орлова Т. Д.* Жанровая дифференциация в журналистике // Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы : матэрыялы Рэсп. навук-практ. семінара, 2-3 чэрвеня 2011 г., Мінск / [рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) і інш.]. Мінск, 2011. С. 175–181
2. *Стрельцов Б. В.* Метод и жанр. Основы творческого мастерства журналиста: учебник для студентов специальности Е 23 01 08-01 «Журналистика». Минск : БГУ, 2002. 118 с.
3. *Тертычный А. А.* Жанры периодической печати : учеб. пособие. М., 2011.
4. *Дускаева Л. Р.* Диалогическая природа газетных речевых текстов. Пермь, 2004.
5. *Бахтин М. М.* Эстетика словесного творчества [Эстетика искусства слова]. Москва: Искусство, 1979. С. 297–325.
6. *Teplyashina A. N., Pavlushkina N. A.* (2017). Media criticism as a form of literary journalism: updating theoretical approaches to a meta-genre. World of Media. Journal of Russian Media and Journalism Studies. № 7. P. 283–310.
7. *Тепляшина А. Н.* Жанровая модель авторской журналистики // Журналистский ежегодник. 2015. № 4. С. 49–54

8. *Клушина Н. И.* Коммуникативная стилистика публицистического текста // Мир русского слова. 2008. № 4. С. 67–70.
9. *Зайцев М. Л.* Распространение контента современными медиа: тенденции и специфика // Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. 2017. № 2. С. 19–23.
10. *Іўчанкаў В. І.* Медыярыторыка: рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз СМІ. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009.